ролямі калектываў. Яны ўзбагачаюцца яшчэ пастаноўкамі п'ес: украінскіх — на беларускай сцэне і беларускіх — на украінскай. У гісторыі развіцця беларускага тэатральнага мастацтва значнае і пачэснае месца заняла драматургія А. Карнейчука. Пастаноўкі яго п'ес «Гібель эскадры» і «Платон Крэчат» з'явіліся ў свой час знамянальным этапам у ідэйнатворчым росце тэатраў імя Я. Купалы і Я. Коласа. Яго-ж п'есы «У стэпах Украіны», «Калінавы гай», «Крылле», якія таксама ўвайшлі ў рэпертуар рэспубліканскіх і абласных тэатраў Беларусі, надоўга засталіся ў памяці нашых гледачоў.

У пасляваенныя гады нашы гледачы пазнаёміліся з п'есамі Я. Галана, В. Сабко, якія таксама мелі заслужаны поспех на нашай сцэне.

У сваю чаргу на Украіне з поспехам былі пастаўлены п'есы беларускіх драматургаў — «Хто смяецца апошнім», «Канстанцін Заслонаў», «Выбачайце, калі ласка!», «Несцерка» і інш.

Пажадана, каб у далейшым нашы братнія творчыя сувязі яшчэ больш умацоўваліся і расшыраліся.

Кастусь **ГУБАРЭВІЧ.**

# У бібліятэцы імя Леніна

У Мінску, у бібліятэцы імя Леніна, адкрыта вялікая выстаўка, прысвечаная тыдню украінскай літаратуры ў Беларусі.

На адным са стэндаў экспануюцца кнігі украінскіх пісьменнікаў, перакладзеныя на беларускую мову. Сярод іх— некалькі выданняў «Кабзара» Тараса Шаўчэнкі, зборнікі апавяданняў і асобныя апавяданні Івана Франка, творы М. Кацюбінскага, Міколы Бажана, Яраслава Галана, Алеся Ганчара, Платона Варанько, Натана Рыбака, Максіма Рыльскага, Паўло Тычыны, Пятро Панча, Алеся Дончанкі і іншых украінскіх пісьменнікаў.

Тут-жа выстаўлены кнігі і часопісы, у якіх расказваецца пра цесныя сувязі Янкі Купалы, Якуба Коласа і М. Багдановіча з украінскай літаратурай.

Сярод кніг беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на украінскую мову — выбраныя творы Янкі Купалы, у тым ліку «Тарасава доля», творы Кандрата Крапівы, Я. Брыля, В. Вольскага, І. Шамякіна, В. Віткі.

Студэнты, вучні, рабочыя з вялікай цікавасцю наведваюць выстаўку.



**На здымку:** у адной з залаў бібліятэкі імя В. І. Леніна. Чытачы знаёмяцца з творамі украінскіх пісьменнікаў, выданымі на беларускай мове.

Фото Ул. Дагаева.